# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ 1-ГА КЛАСА ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАЗДЗЕЛА “ВУСНЫ КУРС”)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Святлана Уладзіславаўна Гукава**

# Мэта даследавання –

тэарэтычна абгрунтаваць і распрацаваць метадычныя сродкі развіцця маўлення вучняў 1-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (на матэрыяле раздзела “Вусны курс”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Задачы даследавання

1. Раскрыць сутнасць і змест паняцця "развіццё маўлення вучняў".
2. Вызначыць псіхолага-педагагічныя асновы развіцця маўлення вучняў 1-га класа.
3. Вызначыць змест навучання, накіраваны на развіццё маўлення вучняў 1-га класа пры вывучэнні раздзела "Вусны курс".
4. Выявіць найбольш эфектыўныя формы, метады і прыёмы работы настаўніка пачатковых класаў па развіцці маўлення вучняў 1-га класа.
5. Распрацаваць метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў пачатковых класаў па развіцці маўлення першакласнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Аб'ект даследавання -

маўленне вучняў 1-га класа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Прадмет даследавання-

працэс развіцця маўлення вучняў 1-га класа пры вывучэнні раздзела “Вусны курс”.

# Метады даследавання

- тэарэтычны аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры па праблеме даследавання;
- сістэматызацыя;
- класіфікацыя;
- педагагічнае назіранне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Змест работы

ГЛАВА 1. ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

1.1. Праблема развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў у навуковай педагагічнай і метадычнай літаратуры

1.2. Псіхолага-педагагічныя асаблівасці развіцця маўлення малодшых школьнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Трактоўка паняцця “маўленне” ў розных навуках

- Псіхалогія: спецыфічная форма паводзін чалавека, якая абслугоўвае два непарыўна звязаныя бакі яго дзейнасці – камунікатыўны і інтэлектуальна-мысліцельны.
- Педагогіка: форма зносін людзей сродкамі мовы.
- Лінгвістыка: вуснае і пісьмовае выкарыстанне мовы з мэтай зносін з іншымі членамі пэўнага калектыву або для ўнутранага маналога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Асноўныя напрамкі, якія ўваходзяць ў паняцце “развіццё маўлення вучняў”:

- выпрацоўка правільнага літаратурнага вымаўлення;
- узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў;
- праца над словазлучэннем і сказам;
- праца над звязным маўленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Змест работы

ГЛАВА 2. ЗМЕСТ, ФОРМЫ І МЕТАДЫ РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ 1-ГА КЛАСА (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАЗДЗЕЛА "ВУСНЫ КУРС")

2.1. Задачы і змест работы развіцця маўлення першакласнікаў пры вывучэнні раздзела "Вусны курс"

2.2. Метады і прыёмы работы па развіцці маўлення вучняў 1-га класа пры вывучэнні раздзела "Вусны курс"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Вусны курс разлічаны на 30 гадзін і складаецца з трох асноўных раздзелаў:

- Вучымся слухаць і вымаўляць (10 г)
- Вучымся слухаць і адказваць (12 г)
- Вучымся слухаць, чытаць і адказваць (8 г)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Спецыфічныя метады арганізацыі працы па развіцці маўлення:

- імітацыйны метад,
- камунікатыўны метад,
- метад канструявання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## У працэсе работы па развіцці маўлення першакласнікаў выкарыстоўваюцца наступныя віды работы:

- работа над словам,
- работа над гукам,
- работа над сказам,
- развіццё звязнага маўлення (работа над тэкстам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вывады

| Задача 1 | Вывад |
| --- | --- |
| Раскрыць сутнасць і змест паняцця “развіццё маўлення вучняў”. | Развіццё маўлення на ўроках беларускай мовы – гэта ўся праца, якая праводзіцца настаўнікам у сувязі з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса: выпрацоўка правільнага літаратурнага вымаўлення; узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў; праца са словазлучэннем і сказам; праца над звязным маўленнем. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вывады

| Задача 2 | Вывад |
|---|---|
| Вызначыць псіхолага-педагагічныя асновы развіцця маўлення вучняў 1-га класа. | Пры арганізацыі работы па развіцці маўлення вучняў неабходна ўлічваць псіхалагічныя асаблівасці развіцця пазнавальных працэсаў малодшых школьнікаў (памяці, увагі, мыслення, успрыняцця), якія непасрэдна аказваюць уплыў на працэс і вынік навучання. У малодшым школьным узросце вядучай застаецца міжвольная ўвага. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вывады

| Задача 3 | Вывад |
|---|---|
| Вызначыць змест навучання, накіраваны на развіццё маўлення вучняў 1-га класа пры вывучэнні раздзела "Вусны курс". | Праца настаўніка першага класа па развіцці маўлення вучняў адбываецца па трох асноўных зместавых лініях: навучанне асэнсаванаму ўспрыманню беларускай мовы на слых; назапашванне лексічнай базы беларускай мовы; першапачатковае навучанне чытанню на беларускай мове. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вывады

| Задача 4 | Вывад |
|---|---|
| Выявіць найбольш эфектыўныя формы, метады і прыёмы работы настаўніка пачатковых класаў па развіцці маўлення вучняў 1-га класа. | На першапачатковым этапе навучання мове пры арганізацыі працы па развіцці маўлення найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца гульнявыя метады і прыёмы, якія ўключаюць вучняў у актыўную самастойную дзейнасць. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вывады

| Задача 5 | Вывад |
|---|---|
| Распрацаваць метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў пачатковых класаў па развіцці маўлення першакласнікаў. | Праведзенае даследаванне дазволіла распрацаваць шэраг рэкамендацый для арганізацыі работы па развіцці маўлення ў вучняў 1 класа: арганізацыя работы на аснове суразмоўніцтва; работа па развіцці маўлення вучняў павінна адбывацца на кожным уроку; вучань выступае ў актыўнай суб'ектнай пазіцыі. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ 1-ГА КЛАСА ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАЗДЗЕЛА “ВУСНЫ КУРС”)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Святлана Уладзіславаўна Гукава**